# АБ РЫНКУ ПРАЦЫ, ПЕНСІЯХ І ДАПАМОГАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны разам з сацыяльнымі партнёрамі былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па сацыяльна адказнай рэструктурызацыі прадпрыемстваў. Калі гаварыць проста, гэта пакрокавае кадравае пераразмеркаванне работнікаў з аднаго прадпрыемства на іншае. «Але, на жаль, далёка не ўсюды гэтыя метадычныя рэкамендацыі працуюць. Магчыма, нам разам з вамі трэба падумаць аб тым, як перайсці на новы ўзровень, замацаваўшы іх заканадаўча», — прапанавала **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Алена МАНКЕВІЧ.**

На калегіі абмяркоўваліся і пытанні распрацоўкі механізму страхавання ад беспрацоўя, а таксама мэтазгоднасць стварэння сістэмы страхавання рызыкі нявыплаты зарплаты пры банкруцтве арганізацый. На думку першага намесніка міністра, станоўчае рашэнне па ўкараненні сістэмы страхавання ад беспрацоўя будзе спрыяць папярэджанню малазабяспечанасці людзей, якія сталі беспрацоўнымі, а таксама павысіць удзел наймальнікаў і работнікаў у папярэджанні беспрацоўя і пераадоленні яго наступстваў.

Адной з задач на 2017-ы ў Мінпрацы і сацабароны называюць утрыманне ўзроўню рэгіструемага беспрацоўя ў межах 2% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым адзначаецца, што, нягледзячы на павелічэнне попыту на працоўную сілу, зніжэнне сярэдняй працягласці беспрацоўя і сярэдняга перыяду працаўладкавання, па-ранейшаму захоўваецца дысбаланс попыту і прапановы на рынку працы і вымушаная няпоўная занятасць. Таму стварэнне новых працоўных месцаў названа як адна з ключавых задач мясцовых органаў улады. У 2017 годзе плануецца працаўладкаваць на знова створаныя працоўныя месцы 70 тысяч чалавек.

## УСЕ ЗВАРОТЫ АБ СТРАХАВЫМ СТАЖЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ РАЗГЛЕДЖАНЫ

У апошнія гады пенсійныя выдаткі складаюць каля 9% ВУП нашай краіны. Цяпер у Беларусі налічваецца больш за 2,5 млн пенсіянераў. Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, пенсіі і дапамогі выплачваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Забяспечваецца суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы на ўзроўні каля 40%. Гэты паказчык павінен захавацца і ў 2017 годзе.

— Пенсіі залежаць ад стажу і заробку. Памеры працоўных пенсій могуць адрознівацца больш чым у тры разы. Максімальная пенсія па ўзросце вышэйшая за сацыяльную пенсію практычна ў шэсць разоў. Максімальная пенсія ў непрацуючага пенсіянера па ўзросце можа складаць каля 70% сярэдняй зарплаты ў краіне. Пры налічэнні да пенсіі надбавак і павышэнняў гэтыя суадносіны яшчэ вышэйшыя, — адзначае Андрэй Лабовіч.

За 2016 год сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце склаў 292,22 руб., у тым ліку ў снежні — 305,79 руб. Сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце склаў 213,07 руб., у тым ліку ў снежні — 221,59 руб. Суадносіны мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце і бюджэту пражытачнага мінімуму пенсіянера летась раўняліся 165,3%.

«У мінулым годзе былі прыняты няпростыя, але абсалютна неабходныя рашэнні па павышэнні пенсійнага ўзросту і новых патрабаваннях па страхавым стажы», — лічыць Васіль Жарко. Аднак віцэ-прэм'ер адзначыў, што паступаюць звароты грамадзян адносна страхавога стажу для прызначэння пенсіі, і даручыў разгледзець гэтыя сітуацыі і прыняць разумнае і ўзважанае рашэнне, а пры неабходнасці і скарэктаваць некаторыя моманты.

Акрамя таго, намеснік прэм'ер-міністра запатрабаваў, каб усе ўстановы сацыяльнага абслугоўвання давалі насельніцтву якасныя і запатрабаваныя паслугі. Пры гэтым Васіль Жарко лічыць неабходным узмацніць узаемадзеянне Мінпрацы і сацабароны з Міністэрствам аховы здароўя. Напрыклад, улічваючы тое, што чарговасць пры пасяленні ў дамы-інтэрнаты псіханеўралагічнага профілю яшчэ актуальная ў некаторых рэгіёнах, віцэ-прэм'ер лічыць магчымым размяшчаць людзей, якія маюць патрэбу ў такіх дамах-інтэрнатах, у свабодных будынках ва ўстановах аховы здароўя і адукацыі.

## БУДЗЕ ЎЗМОЦНЕНА ПАДТРЫМКА НАЙБОЛЬШ УРАЗЛІВЫХ КАТЭГОРЫЙ СЕМ'ЯЎ

Летась у асобных арганізацыях практычна кожнага рэгіёна была адзначана запазычанасць па выплаце дапамог на дзяцей. Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ў гэтай сітуацыі былі прынятыя аператыўныя меры. У асобных выпадках прымаліся рашэнні аб выплаце дапамог органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Цяпер, па словах Андрэя Лабовіча, запазычанасці па выплаце дапамог няма, надалей гэтае пытанне будзе трымацца на асаблівым кантролі.

Спецыялісты адзначаюць, што летась упершыню быў дасягнуты натуральны прырост насельніцтва, і лічаць вельмі важным захаваць станоўчыя тэндэнцыі нараджальнасці. Для гэтага, як лічыць Андрэй Лабовіч, неабходна падтрымаць самыя ўразлівыя катэгорыі сем'яў, якія не маюць магчымасці ўласнай працай забяспечыць свой дабрабыт. Гэта сем'і з дзецьмі-інвалідамі, а таксама сем'і, дзе самі бацькі з'яўляюцца інвалідамі.

Зараз рыхтуецца да другога чытання ў Палаце прадстаўнікоў праект закона аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Дакумент змяшчае новыя нормы, накіраваныя на ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян.

Так, бацькам, якія даглядаюць дзіця-інваліда, плануецца даць права працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці або дома, пры гэтым выплата дапамогі па доглядзе за дзіцем будзе захавана. Прапануецца таксама павысіць памер дапамогі па доглядзе за дзіцем-інвалідам, якому ўстаноўлена трэцяя ці чацвёртая ступень страты здароўя.

Жанчынам, якія атрымліваюць дапамогу па цяжарнасці і родах у мінімальным памеры, прапануецца даваць даплату да памеру дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў за перыяд пасля нараджэння дзіцяці. Таксама мясцовым органам улады будуць прадстаўлены больш шырокія паўнамоцтвы па аказанні сацыяльных паслуг сем'ям з дзецьмі.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Як нас дураць

# ГАНДЛЯРЫ ЗОРКАМІ

**Беларусам прапануюць купляць назвы нябесных цел**

**Абяцанне падарыць зорку з неба — класічны прыём з донжуанскага арсенала. І хоць з ажыццяўленнем гэтага на практыцы ёсць некаторыя складанасці, паненкам такая рыторыка даспадобы. Прыемна — ліха яго бяры! — калі дзеля цябе гатовыя на розныя дзівацтвы. Але пры наяўнасці пэўнай сумы грошай нават немагчымае магчыма.**

Зоркай, што ззяе за дзясяткі светлавых гадоў, вы не завалодаеце. А вось даць ёй імя на свой густ, аказваецца, не праблема. Заплаціўшы пэўную суму, вы можаце назваць «свабодную» зорку, напрыклад, у гонар каханай дзяўчыны. Такую паслугу прапануе адна са сталічных кампаній. Назва ўносіцца ў «міжнародны зорны каталог», а вы атрымліваеце сертыфікат і карту з указаннем «вашага» нябеснага цела...

Бясконцыя абшары космасу здаўна абуджалі ў чалавецтве не толькі рамантычныя памкненні, але і камерцыйны сверб. Знаходзяцца ўвішныя спадары, што прадаюць дзялянкі зямлі на Месяцы і Марсе. І цікава, што пакупнікі таксама ёсць! Нехта набывае сертыфікаты проста дзеля забаўкі. А іншыя такім чынам робяць «інвестыцыі» на будучыню. Напэўна, у чаканні часу, калі злётаць на Марс будзе, як маршруткай «Мінск—Ждановічы» праехацца. Але ці будзе мець дакумент на марсіянскія ўгоддзі юрыдычную сілу — вялікае пытанне.

Што да куплі зорных назваў, то на сайце кампаніі вас папярэджваюць: правы валодання нябесным целам выданы дакумент не дае. А грошы бяруць за ўнясенне абранага вамі «імені» ў каталог. Цана на гэтыя паслугі, трэба сказаць, кусаецца. Назва для самай цьмянай зоркі каштуе 52,5 рубля. З іх 21 рубель — гэта надрукаванне «дакументаў». А самы «пафасны» варыянт палегчыць вашу кішэню аж на 1365 рублёў! Затое зорку можна будзе пабачыць простым вокам, без тэлескопа. Уражвае і спіс дадатковых паслуг: ад простага ламінавання (6,3 рубля) да стварэння «пашпарта» зоркі з яе гістарычнымі і фізічнымі характарыстыкамі (2100 рублёў). Зрэшты, такія расцэнкі не павінны пужаць кліента. Бо зорка — гэта вам не цюльпаны ў пераходзе купіць. Гэта сур'ёзная заяўка аб сваіх пачуццях. Мінуць гады і стагоддзі, а імя вашай каханай назаўсёды застанецца ў астранамічным каталозе. Так бы мовіць, у Вечнасці...



Але не спяшайцеся радавацца, атрымаўшы на рукі запаветны сертыфікат. Сваёй вартасцю ён мала чым адрозніваецца ад «дакументаў» на марсіянскія шэсць сотак. Бо абранае вамі імя для зоркі не стане агульнаўжывальным.

— Адзіная арганізацыя, якая мае права даваць назвы нябесным целам, — гэта Міжнародны астранамічны саюз (МАС), — сцвярджае **кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Альгерд КУЗНЕЧЫК, дырэктар абсерваторыі Белдзяржуніверсітэта.** — Прычым толькі малая частка зорак мае ўласныя «імёны», якімі мы карыстаемся ў сілу традыцыі. А ўсе астатнія назвы складаюцца з камбінацый лацінскіх літар і лічбаў, што прысвойваюцца паводле пэўнага алгарытму. І толькі гэтыя найменні, зацверджаныя МАС, ужываюцца астраномамі ва ўсім свеце. Можна весці якія заўгодна «альтэрнатыўныя» каталогі, але навуковай супольнасцю яны нават не разглядаюцца.

Словы беларуская навукоўца пацвярджае і афіцыйны сайт МАС. Цэлы раздзел яго прысвечаны праблеме гандлю зорнымі імёнамі. Зрэшты, для самой арганізацыі праблем ніякіх няма: яна не займаецца камерцыяй. І да «касмічных» дзялкоў не мае ніякага дачынення. Аб чым і папярэджвае далёкіх ад навукі людзей.

За што ў такім разе кліент плаціць грошы? За тое, каб абраную ім назву ўнеслі ў нейкі зорны рэестр, які не прызнаецца навукоўцамі, і выдалі прыгожую паперку. Прычым у махлярстве арганізатараў гэтай бізнес-схемы абвінаваціць цяжка. Каталог ёсць? Ёсць. Якія прэтэнзіі? Дый на сайце кампаніі ёсць пазнака, што да МАС гэты каталог дачынення не мае. Але ж далёка не кожны абывацель разбіраецца ў падобных тонкасцях. А назваць зорку ў гонар блізкага чалавека — прапанова спакуслівая...

Зрэшты, можна абысціся і меншымі выдаткамі. Выбіраеце любую з 30 мільярдаў трыльёнаў зорак, што ёсць у аглядным Сусвеце, заказваеце ў любой паліграфічнай канторы «сертыфікат» — і вуаля! Маеце, па сутнасці, тое ж самае, але без пераплаты. І можаце смела прэзентаваць дарагому вам чалавеку. А калі хто прычэпіцца з пытаннямі, адказвайце, што зорка зарэгістравана ў вашым асабістым каталозе.

Хоць шанц даць зорцы імя, што будзе прызнана ва ўсім свеце, вы маеце. Для гэтага досыць усяго толькі... самастойна адкрыць гэтую зорку! І колькі б ні было нулёў на вашым банкаўскім рахунку, іншых магчымасцяў міжнародная навуковая супольнасць не прадугледжвае.

**Валянцін БОЙКА.** *boika@zviazda.by*

■ Традыцыйныя каштоўнасці

# ВЫРАСЦЕ САД, ПАДРАСТУЦЬ І ДЗЕЦІ

**Гэтай вясной дэкаратыўныя фруктовыя дрэвы і кустоўе рэдкіх парод плануюць высадзіць разам свяшчэннаслужыцелі, урачы, шматдзетныя матулі і жанчыны, якія пагадзіліся ў крызіснай сітуацыі захаваць цяжарнасць. Упрыгожыць плануецца некалькі ўстаноў аховы здароўя і храмаў у кожнай вобласці. У Міністэрстве аховы здароўя спадзяюцца, што першы падобны вопыт стане штогадовым і будзе сімвалізаваць вяртанне да традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.**

— Тэматыка прыроднага ўладкавання з'яўляецца для нашага прыхода прыярытэтнай, — кажа **старшыня Сінадальнай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства, настаяцель прыхода храма Свяціцеля Мікалая Японскага ў Мінску протаіерэй Павел СЯРДЗЮК.** — Рэспубліканская акцыя нездарма атрымала назву «Сакуры цвет на зямлі беларускай». Святы раўнаапостальны Мікалай Японскі быў закліканы некалі ў Японію па просьбе першага консула Расійскай імперыі ў Японіі Іосіфа Антонавіча Гашкевіча — выпускніка Мінскай духоўнай семінарыі, ураджэнца Беларусі, які завяршыў свой зямны шлях недалёка ад Астраўца. Дакладнае месца пахавання, на жаль, дагэтуль невядомае. Праз супрацоўніцтва з Японіяй мы, можа быць, адкрыем і невядомыя старонкі жыцця сына Беларусі. А пакуль ужо ў лютым будзем нарыхтоўваць пасадачны матэрыял.

Дрэвы і кустоўе прадаставіць Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, у якім захоўваецца генафонд больш як 12 тысяч найменняў раслін. Дарэчы, сакура, якая адносіцца да групы вішні, таксама там ёсць. Але ў межах акцыі плануецца высадзіць іншыя дрэвы і кустоўе. Гэта можа быць, напрыклад, алыча, вішня лямцавая, айва японская, бружмель сіні, чарнаплодная рабіна, кізіл... «Гэта вельмі важнае ўменне — сузіраць прыгажосць, нікуды не спяшацца, а проста атрымліваць асалоду ад таго, што бачыш, і гэта было б карысна пераняць з Усходу», — заўважае **загадчык лабараторыі інтрадукцыі драўнінных раслін Цэнтральнага батанічнага сада, кандыдат біялагічных навук Ігар ГАРАНОВІЧ.**

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# Адміністратар прысвоіў грошы,

**каб памірыцца з жонкай**

**У сталіцы затрыманы раней судзімы 42-гадовы мінчанін, які, працуючы адміністратарам на аўтамыйцы, прысвоіў грошы кліентаў.**

— У міліцыю звярнуўся дырэктар адной з аўтамыек, які расказаў, што ў яго адсутнасць на працягу некалькіх дзён з касы былі ўкрадзены грошы — 320 рублёў. Было ўстаноўлена, што іх прысвоіў 42-гадовы адміністратар. Мужчыну затрымалі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Высветлілася, што, скарыстаўшыся адсутнасцю дырэктара аўтамыйкі, ён вырашыў забраць грошы, атрымаўшы ад кліентаў. Іх ён пасля патраціў на сваю жонку, каб памірыцца з ёй: жанчына пастаянна абвінавачвала мужа ў адсутнасці ўвагі і пагражала разводам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 15.02.2017 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 1 процентный пункт – до 16 процентов годовых, **с 16.03.2017** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 1 процентный пункт плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также, в соответствии с условиями договора пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь, УНП 100693551.